Гасянкоў У.

# ПАВЕТРАНЫ БАЕЦ

**Даўно знікла з твару зямлі Мсціслаўскай вёска Нашкавічы, што размяшчалася паблізу Шамаўшчыны. У Нашкавічах, у сялянскай сям'і Жыгуновых, у 1920 годзе нарадзіўся сын, якога бацькі назвалі Уладзімірам.**

Тут, у вёсцы, прайшло яго дзяцінства, юнацкія гады, вучоба ў мясцовай школе. Потым маці, Марфа Карнееўна, праводзіла сына ў Адэскую ваенна-паветраную .школу пілотаў. Лейтэнант Уладзімір Жыгуноў стаў ваенным лётчыкам. Яго накіравалі ў 140-вы штурмавы авіяцыйны полк.

У невялікім газетным артыкуле, вядома, усё не расказаць аб тых неверагодна цяжкіх першых гадах вайны. Полк нёс страты, паколькі ў небе на той час мела перавагу варожая авіяцыя.

Але звенні і эскадрыллі палка працягвалі вылятаць на штурмоўку варожых калон, аб'ектаў, мастоў і пераправаў, скапленне баявой тэхнікі. ІЛ-2 Уладзіміра Жыгунова па некалькі разоў на дзень узлятаў з палявых аэрадромаў на баявыя заданні.

На шырокіх прасторах краіны летам 1943 года разгарэліся цяжкія баі, з абодвух бакоў – настуючых і абараняючыхся – у іх былі ўцягнуты мільёны людзей, вялізная колькасць тэхнікі. Гвардзейскі авіяштурмавы 140-ы полк камандванне перакідвала з аднаго ўчастка фронту на другі.

Уладзімір . Раманавіч, на той час старшы лейтэнант, камандзір авіязвяна, успамінаў, што "лятаючым тапкам", як называлі тады самалёты штурмавой авіяцыі, давял'ося бамбіць, абстрэльваць варожыя калоны, скапленні тэхнік, артылерыйска-мінамётныя пазіцыі фашыстаў пад Харкавам, Палтавай; Крывым Рогам, удзельнічаць у баях на Курскай дузе, пад Кіравагградам, Корсунь-Шаўчэнкаўскай аперацыі.

За выніковасць дзеянняў звяна Жыгуноў быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, а пазней, за ўмелыя дзеянні, ужо ў час вызвалення Польшчы, Румыніі, Чэхаславакіі, камандванне палка ўручыла афіцэру ордэн Айчыннай вайны першай ступені.

Спрактыкаваны, умелы пілот Жыгуноў умеў трапна пакласці "у яблычка" бомбавы груз, накрыць кулямётнымі чэргамі і жывую сілу ворага, імкліва ўключыцца ў атаку на нямецкія самалёты. Вялікі спіс праведзеных ім штурмовак, разбітай тэхнікі, знішчаных ваенных аб'ектаў, пераправаў, аўтакалон з розным рыштункам, эшалонаў, вузлоў супраціўлення.

Прадстаўляючы лётчыка Жыгунова да чарговага ордэна Айчыннай вайны другой ступені, генерал-лейтэнант Разанаў пісаў, што толькі высокае лётнае майстэрства, адказнасць за выкананне загада, за

людзей авіязвяна дазваляюць Жыгунову выходзіць пераможцам з кожнага бою.

Дзесяткі падзяк запісаны на рахунку ваеннага пілота, атрыманыя ад Галоўнакамандуючага, маршалаў Конева, Ротмістрава, генерал-палкоўніка Гарунова, камандвання арміі, дывізіі, палка. 194 паспяховых баявых вылетаў, вялікая колькасць знішчаных аб'ектаў ворага, нанесеныя яму страты ў жывой сіле і тэхніцы.

140-ы гвардзейскі штурмавы авіяполк, дзе служыў Жыгуноў, наносіў бомбавыя ўдары па Берліну. У час баявых вылетаў заглушыў агонь трох артылерыйскіх батарэй ворага, знішчыў 9 варожых танкаў, тры дзесяткі аўтаматчыкаў, некалькі наземных пунктаў супраціўлення.

Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны наш зямляк палкоўнік-авіятар Уладзімір Раманавіч Жыгуноў быў удастоены высокага воінскага звання – Героя Савецкага Саюза. Яшчэ 15 гадоў запар, да 1960 года, ён працягваў служыць у радах Узброеных Сіл краіны. Перадаваў свой баявы вопыт маладым лётчыкам, што прыйшлі на змену авіятарам-гвардзейцам часоў мінулай вайны.

Зволіўшыся з радоў арміі, Уладзімір Раманавіч пасяліўся ў Варонежы, стаў працаваць інжынерам на адным з мясцовых прадпрыемстваў. Ён неаднаразова наведваў родную Мсціслаўшчыну, сустракаўся з землякамі.

**Гасянкоў, У. Паветраны баец / У. Гасянкоў // Святло Кастрычніка (Мсціслаў). — 1992. — 19 жніўня. — С. 2.**